**Ярмоленка А.У. (Гомель)**

# Нацыянальна-міфалагічныя архетыпы ў рэцэпцыі Максіма Багдановіча і Максіма Гарэцкага

Развіццё літаратуры «нашаніўскай» пары нельга ўявіць без відавочнай арыентацыі на фальклорную і міфалагічную спадчыну продкаў. Як адзначаюць сучасныя даследчыкі, вызначальным для творчасці М. Багдановіча і Я. Коласа з'яўляецца архетып Маці-зямлі, В. Ластоўскага – лабірынт, праз які пададзена рэальнасць пачатку XX ст., калі беларусы спрабавалі выбіцца на свой нацыянальны шлях. Творы М. Гарэцкага – яркі прыклад міфалагічнага светасузірання, дзе сплаўлены ў адно страх і цікаўнасць чалавечай душы ў яе жаданні пазнаць свет. Пра ўплыў фальклорнай і міфалагічнай традыцыі на творчасць класікаў беларускай літаратуры згадвае М. Тычына: «Карані і крона»: «Ён (фальклор. – *А.Я.*) суправаджаў беларускую літаратуру на працягу ўсяго яе развіцця. Аднак асабліва інтэнсіўна ён узаемадзейнічаў з літаратурай у класічны перыяд, калі складвалася яе жанравая і стылявая сістэма, калі на поўную моц разгарнуўся талент такіх пісьменнікаў, як Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, З. Бядуля, М. Гарэцкі і інш. Гэта была яркая «ўспышка» цікавасці да фальклору, які ўжо ўспрымаўся як мастацкая каштоўнасць, што няўхільна знікае, і адначасова як матэрыял для адраджэння нацыянальнай культуры» [4, с. 72].

Спасціжэнне народнай душы – вось для чаго выкарыстоўвалі фальклорныя і міфалагічныя архетыпы класікі. Цікавасць іх да фальклору і міфалогіі цесна звязана з грамадзянскай місіяй літаратурнай творчасці. Названыя вышэй пісьменнікі знаходзілі ў вуснай народнай творчасці не толькі павучальныя прыклады паводзін, якія ў свой час шырока выкарыстоўваў ў творах В. Дунін-Марцінкевіч, не толькі крытычныя адносіны да існуючага ладу, якія шукаў Ф. Багушэвіч. Для пісьменнікаў «нашаніўскага» адраджэння народныя песні і казкі былі выяўленнем народнай псіхалогіі, «беларускай душы», дапамагалі паказаць глыбінна-істотнае ў нацыянальным характары. Родная літаратура як бы падхапіла страчаныя скарбы народнай творчасці і здолела асэнсаваць іх у новым кантэксце тагачасных мастацкіх кірункаў. Сінтэз хрысціянскіх і фальклорных вобразаў і сімвалаў, здабыткаў сусветнай культурнай традыцыі быў тым штуршком, які ўзняў беларускую літаратуру на еўрапейскі ўзровень, прымусіў гаварыць пра беларускую нацыянальную свядомасць, беларускую нацыянальную традыцыю, асаблівасці нацыянальнага светаўспрымання беларусаў. Нездарма М. Гарэцкі ў артыкуле «Збіранне і апрацоўка фальклору» надаваў выключнае значэнне вуснай народнай творчасці, пісаў аб небходнасці збірання і апрацоўкі скарбаў народнай думкі, пра свядомае выкарыстанне пісьменнікамі здабыткаў беларускай міфалогіі і фальклору: «Говары вуснай паэзіі маюць важнае навукова-грамадскае і літаратурна-мастацкае значэнне. Збіранне і даследаванне іх асабліва патрэбна цяпер, у пару беларусізацыі і новага будаўніцтва беларускай культуры ў БССР. Збіранне нашых вусных твораў можа мець масавы характар, можа ажывіць усю нашу краязнаўчую працу <...> Гэтае даследаванне раскрые нам сутнасць самабытна-беларускай паэтычнай творчасці. Яно будзе дапамагаць нашым паэтам і пісьменнікам тварыць і працаваць па-беларуску з належнай тэарэтычнай свядомасцю і тэхнічнай дасканаласцю» [2, с. 276].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

М. Багдановіч у артыкуле «Забыты шлях» у сваю чаргу адзначаў: «Як кожны народ мае сваю нацыянальную душу, так ён мае і свой асаблівы склад (стыль) творчасці, найбольш прыдатны да гэтай душы. Ёсць ён і ў нас, беларусаў, і мы мусіма звярнуцца да яго, каб улажыць што-небудзь сваё ў скарбніцу светавой культуры, каб уліць у нашую паэзію свежыя сокі, каб стаць бліжэй да душы роднага народа, лепі паталіць яе духоўную смагу і запраўды ўзяцца за вялікую працу: развіццё беларускай народнай культуры» [1, с. 288].

Пошук адказу на спрадвечныя філасофскія пытанні, імкненне пазнаць сутнасць бачнага ўласціва М. Багдановічу і М. Гарэцкаму. Іх творчасць можа быць прыкладам выкарыстання міфалагічных і фальклорных архетыпаў. «М. Багдановіч рана ўсвядоміў, наколькі прыгожая і важная рыса чалавечай натуры – любоў да роднай зямлі <...> Думаецца, што назву вершаванаму цыклу “У зачарованым царстве” падказаў паэту казачны сюжэт, паводле якога зачараваная злымі сіламі каралеўна абуджаецца ад пацалунку, моцнага і чыстага пачуцця кахання. А разам з ёй ажывае і ўсё каралеўства <...> Так М. Багдановіч уяўляў Радзіму на пачатку творчасці. Пазней у яго вершах (“Пагоня”) з'явіўся адкрыты зварот: “радзіма-маці”» [3, с. 21]. Такім чынам, у цыкле ранніх вершаў «У зачарованым царстве» М. Багдановіч стварае вобраз зачараванага кутка зямлі, прытулку лесуна, вадзяніка, змяінага цара і русалак. Зачараваная зямля павінна абудзіцца ад навеянага злымі чарамі векавога сну, даць жыццё наступным пакаленням беларусаў, якія, як антычны герой Антэй, прынікнуць да яе, каб уліць бадзёрасць у слабеючыя жылы, зварушыць сілы душы.

У творчасці М. Гарэцкага прадстаўлены персанажы ніжэйшай міфалогіі, асабліва ў ранніх апавяданнях зборніка «Рунь». Гэта і архетып ваўкалака ў творы «Што яно?», русалак і цмока ў апавяданнях «Цёмны лес» і «Патаемнае», трасцы з аднайменнага апавядання. Але калі ў М. Багдановіча паўстае зачараванае царства, якое чакае свайго абуджэння, то ў М. Гарэцкага – цёмны і таемны край, які цяжка зразумець, які ставіць пытанні перад маладым інтэлігентам і не заўсёды дае адказ («У лазні», «Роднае карэнне»).

Героі апавядання «Цёмны лес» – жывёлы, птушкі, дрэвы «цёмнага лесу», які з’яўляецца сімвалічным увасабленнем Беларусі. Гэта край дрымучых пушч і балот, дзе дагэтуль жывуць міфалагічныя істоты, патаемная краіна, якую не зведаць нікому. У творы адухаўляюцца стыхіі светабудовы: зямля, агонь, паветра, вада, а таксама сакралізуецца жывёльны і раслінны свет. Прастора дзеяння ў М. Гарэцкага – лес, вёска ці дарога ў вёску, дзе сканцэнтравана ўсё патаемнае, невядомае, дзе людзі не страцілі сувязі з прыродай і адухаўляюць навакольны свет. Час дзеяння ў многіх творах – ноч, калі чалавек застаецца сам-насам з праяўленнямі сіл прыроды. Ноч, а таксама сон, – гэта магчымасць вызваліцца ад усталяваных норм і правіл, паглыбіцца ў самога сябе, даць адказ на хвалюючыя пытанні. Праз усю творчасць М. Гарэцкага праходзіць пытанне, вызначальнае для лёсу беларусаў: ці можна жыць, адарваўшыся ад гэтага цёмнага і таемнага краю, ад «роднага карэння», што будзе з душой беларуса, калі ён забудзецца на традыцыі продкаў?

Як бачым, творчасць М. Багдановіча і М. Гарэцкага – сінтэз міфалагічных сюжэтаўтваральных архетыпаў, асноўная частка якіх экспліцытныя, а некаторыя прадстаўлены імпліцытна. Усе яны з’яўляюцца дзеючымі асобамі, або нават

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

галоўнымі героямі, па-майстэрску ўпісаны ў сюжэт, дапамагаюць стварыць мадэль светаўспрымання беларусаў.

**Літаратура**


1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – 2-е выд. – Мінск, 2001. – Т. 2 : Маст. проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі, нататкі, чарнавыя накіды.
2. Гарэцкі, М. Творы / М. Гарэцкі – Мінск, 1990.
3. Друк, Г.М. У храме Слова: міфатворчасць Віктара Казько : манаграфія / Г.М. Друк. – Мінск, 2005.
4. Тычына, М.А. Карані і крона: фальклор і літаратура / М.А. Тычына. – 2-е выд. – Мінск, 2002.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ